**УДК 821.161.3'06:141.32**

***К. М. Бандурына***

## Рэцэпцыя экзістэнцыйных праблем сучаснай беларускай літаратурай

*Сучасная беларуская літаратура – з’ява шматпланавая і разнастайная. Той спектр праблем, які ўздымаюць нашы пісьменнікі, характар і спосаб іх вырашэння дазваляюць гаварыць пра адпаведнасць іх твораў актуальным тэндэнцыям у развіцці еўрапейскай літаратуры. Аднымі з такіх праблем з’яўляюцца праблемы экзістэнцыі чалавека. У якасці прадмета даследавання ў нашай рабоце выступаюць творы Евы Вежнавец, Алены Брава, Вольгі Гапеевай, Вальжыны Морт, Альгерда Бахарэвіча, Ігара Бабкова, Барыса Пятровіча.*

Праблемы існавання чалавека займаюць адно з галоўных месцаў у сусветнай літаратуры. Іх закраналі ў сваёй творчасці такія вядомыя аўтары, як Арыстоцель, Р. Дэкарт, Ж.-П. Сартр, С. дэ Бавуар, А. Камю, Ф. Ніцшэ, М. Хайдэгер, М. Бубер, М. Бярдзяеў і інш. Не абмінае гэтыя пытанні і беларуская літаратура. У айчынным літаратуразнаўстве, філасофіі і культуралогіі праблемы чалавечай экзістэнцыі даследуюць Г. Адамовіч, І. Шаўлякова, Ю. Барысевіч, В. Акудовіч і іншыя. Экзістэнцыйныя матывы прысутнічаюць у творах многіх беларускіх аўтараў, пачынаючы ад класікаў беларускай прозы (К. Чорны, М. Гарэцкі) і заканчваючы прадстаўнікамі сучаснага пакалення пісьменнікаў (А. Бахарэвіч, Ю. Станкевіч, І. Бабкоў).

Творчасць Евы Вежнавец – узор вострасацыяльнай літаратуры. Пісьменніцу цікавяць не толькі ўласныя праблемы накшталт “я – жанчына”, у сваіх творах яна ўздымаецца ад прыватнага да агульнага: піша пра абязлічванне чалавека, страту ім сваёй індывідуальнасці, падпарадкавання масе. Які б твор Евы Вежнавец мы ні ўзялі ў рукі, ужо з першых старонак зразумела: асобу героя / гераіні паглынае, нівелюе натоўп.

Адлюстраванне працэсаў страты ўнікальнасці чалавека займае не адну старонку творчасці аўтаркі. Ева Вежнавец з зайздроснай упартасцю спрабуе разабрацца ў розных маральна-этычных праблемах чалавека, якія хвалююць звычайнага сярэднестатыстычнага беларуса. Нават апісанне Евай Важнавец знешняга выгляду героя выражае разгубленасць чалавека, знікненне яго ўласнага “Я”: “Брудная вопратка, цяжкі пляцак, жоўтая марынарка, блакітныя джынсы, паўчаравікі і шэрыя мужчынскія шкарпэты, сутулая постаць і танныя акуляры на носе – вось мой партрэт” [1, с. 11].

Адно з самых балючых для гераінь Евы Вежнавец пытанняў – міжполавыя ўзаемаадносіны, роля жанчыны ў іх. Праз вусны сваіх персанажаў пісьменніца рэтранслюе распаўсюджаны ў патрыярхальным грамадстве стэрэатып пра непаўнавартаснасць жанчыны, безумоўную ўладу мужчыны над ёю як над прадметам, што абавязкова павінен камусьці належаць: “Жанчына не павінна быць нічыйнай, – пераконваў нас з Ганнаю Андрэй” [2].

У адрозненне ад гераінь Евы Вежнавец, жанчыны ў творах Алены Брава больш заглыбленыя ў сябе, у свой унутраны свет. Яны ўвесь час шукаюць адказы на шматлікія філасофскія пытанні і апынаюцца перад выбарам у розных экзістэнцыйных сітуацыях. У сваёй вядомай кнізе “Каменданцкі час для ластавак” А. Брава ўзняла адвечнае пытанне: для чаго мы прыходзім у гэты свет? Яе героі праходзяць праз шмат выпрабаванняў, пасля якіх святла ў канцы тунэля болей не становіцца. Калі паляпшэнняў не назіраецца, чалавек спрабуе зразумець: а навошта тады ўсё гэта? У сваіх творах пісьменніца сцвярджае, што сэнс у чалавечага існавання ўсё ж ёсць: “Гледзячы ў калюжыну, не бачыць бруду, а бачыць адлюстраванне сонца” [3, с. 21].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Не абыходзіць увагай пісьменніца і феномен кахання. Гераіням А. Брава не хапае адчування еднасці з іншым чалавекам, ім патрэбна быць каханымі для таго, каб іх існаванне мела свой сэнс. І дзеля гэтага чалавек, якому не дадалі кахання бацькі, сябры і наогул увесь акаляючы свет, будзе згодны паверыць у любую добра разыграную гульню іншага. Жаданне кахаць у такім выпадку перастае існаваць наогул. Гераіня нашумелага некалі рамана "Менада і яе сатыры" адчувае паўнавартаснаць свайго існавання толькі праз адносіны з мужчынам. Фактычна мы назіраем падмену матэрыяльнага і духоўнага, кахання і сексу, і за гэтым хаваецца суцэльная адзінота асобы, яе немагчымасць справіцца з абсурднасцю ўласнага жыцця: "Юлечка не хлусіць: яна становіцца матэрыяльным целам, толькі калі чарговы "Ён" кахае яе, у астатні час яна проста фантом. <...> Што да яе душы, яна застаецца незапатрабаванай. Гэты працэс падобны раз'яднанню гогалеўскай Кацярыны на душу і цела, якое спачывае каменным сном, нібыта ў дамавіне, пакуль Чараўнік гутарыць з яе эфірным двайнікам. Толькі ў Юлі, гаротніцы, усё наадварот…" [4, с. 55].

У яшчэ адной вядомай беларускай пісьменніцы Вольгі Гапеевай універсальнае значэнне набывае безасабовасць: ад страты катэгорыі роду героямі рамана "Рэканструкцыя неба" да абагуленасці часу і месца дзеяння, абязлічвання пачуццяў і самога існавання. Да прыкладу, каханне ў рамане страчвае сваю ўнікальнасць, становіцца паўсядзённай з'явай: "Я старанна праектую свае сказы, нібыта архітэктар, асабліва, калі кажу, што ты – чалавек, якога я кахаю, пазбягаючы пры гэтым слова «адзіны», якое пазбавіць мяне магчымасці будаваць іншыя палацы ў гонар іншых чалавекаў, якіх я кахаю. Да таго ж, калі я цалуюся з не-табой, гэта адбываецца на гадзіну раней. У тваім часе я заўсёды шчырая і заўсёды з табой" [5].

Часава-прасторавая парадыгма ў В. Гапеевай згладжваецца, губляе свае арыенціры. Гэты працэс гіпербалізуецца падменай некаторых паняццяў. Да прыкладу, гады становяцца ўвасабленнем штучнасці рэчаў, калі замяняюць сабою грошы, а вымярэнне часу ў больш шырокім сэнсе набывае адмысловую канатацыю адлюстравання чалавечых стасункаў: "10 крыўджання (па новым стылі) 0001 году, гэта калі? Заўтра, сёння, учора, пазаўчора?" [5]. Нягледзячы на размытасць паняццяў, часавыя катэгорыі "заўтра" і "сёння" ў "Рэканструкцыі неба" маюць выразнае размежаванне: "заўтра" ўяўляецца аўтарцы як хранічнае захворванне, у той час як адзіным здаровым станам чалавека ёсць пераажыванне "сёння".

Што датычыцца прасторы, то яна таксама не мае выразнай акрэсленасці. Адзіным дзейсным апазнавальным знакам для персанажаў В. Гапеевай становіцца лямпачка – своеасаблівае ажыццяўленне метафары "святло ў канцы тунэля". Героі перастаюць існаваць у канкрэтнай прасторы, калі іх лямпачкі згараюць. Такім чынам страчваецца сэнс існавання асобы, асабліва калі святло лямпы згасае на фоне сонечных промняў: "Сонечны пылок ставіў пад сумнеў магчымасць існавання як такога, і ўжо цяжка было зразумець, ехаў ты сам ці цябе везлі" [5].

У прозе Вальжыны Морт таксама гучаць вышэй узгаданыя праблемы. Яе героі, атмасфера вакол іх, час і прастора, стасункі і пачуцці – усё гэта перамешваецца, блытаецца, страчвае свой звычайны выгляд і такім чынам дэфармуе свет наогул: "Дзве гадзіны апоўдні. Холадна. Аўтобус робіць прыпынкі праз кожныя паўгадзіны і абавязкова запаўняецца новымі чалавечымі целамі" [6, с. 90].

У дэфармаванай прасторы аўтабіяграфічная гераіня В. Морт са зборніка "Я тоненькая як твае вейкі" шукае паратунку ў каханні: "Я чакаю, пакуль ты папаліш пад мастом, і мы рушым далей. Дамы звужаюцца і звужаюцца з кожным новым паверхам, быццам бы час, вусны набліжаюцца да маіх, і я хапаюся за іх як за апошнюю саломінку" [6, с. 80]. Але каханне таксама трансфармуецца ў нешта іншае: жанчына становіцца прадметам і ў роспачы ад здрады нагадвае "вялізную цяжкую машыну" [6, с. 100], а пачуцці і адчуванні, наадварот, ажываюць: "Я прачынаюся ад нясцерпнай

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

спякоты. Ізноў лета. Ізноў раніца. Ізноў гопнікі пад акном. Скура прыліпла да цела, як мокрая адзежа. Не люблю” [6, с. 104].

Герой рамана “Дзеці Аліндаркі” аднаго з самых папулярных сучасных беларускіх празаікаў Альгерда Бахарэвіча не адчувае рэальнасці свайго існавання. Шэрае, змрочнае і, натуральна, безвыходнае, яно бачыцца прамой спасылкай на сартраўскую закінутасць: “Усё дазволена, калі Бога не існуе, а таму чалавек закінуты, яму няма на што абаперціся ні ў сабе, ні па-за сабою” [7]. Абсурднасць быцця адлюстроўваецца ў адной з улюбёных катэгорый у творах Альгерда Бахарэвіча – у смерці.

Яшчэ адным ключавым паняццем сучаснай мужчынскай прозы становіцца адзінота. У адрозненне ад жаночай прозы, дзе героі безаблічныя і часта разбураюць нормы паводзін натоўпу, у мужчынскай прозе героі больш эгацэнтрычныя, заглыбленыя ў сябе, у свой унутраны свет. І таму адзінота як адлюстраванне “чалавека-рэчы-ў-сабе” становіцца магістральнай тэмай большасці твораў мужчынскай прозы.

У А. Бахарэвіча, да прыкладу, адзінота мае самыя розныя аблічча (адзінота і алкагалізм, адзінота пасля здрады, адзінота дзіцяці), праз якія пісьменнік адлюстроўвае важныя праблемы сучаснага грамадства, звяртае ўвагу не толькі на дарослую асобу, але і на жыццё дзіцяці.

У творах Ігара Бабкова адзінота набывае метафізічнае адценне. Пісьменнік абстрагуецца ад знешніх праяў чалавечай сутнасці і звяртаецца да экзістэнцыяльнай самоты чалавека як “рэчы-у-сабе”: “Запытацца – як – калі – выспела гэтае цела, гэтая абалонка і што ўнутры? Якім чынам душа прыняла форму безнадзейнай выспы, замкнутае манады, – сярод абставінаў, дэкарацыяў, іншых целаў? Куды, бяздомная вандроўніца, ідзеш, паліш цыгарэту, аглядаеш урбаністычныя краявіды? Адна. Адна” [8, с. 64].

Экзістэнцыйна-філасофскі характар адзінота набывае ў творах Барыса Пятровіча. Першая частка трыпціху “Стах” пад назвай “Экспрэс” вылучаецца з усіх трох частак вялікай колькасцю аўтарскіх адступленняў, насычаных развагамі пра адзіноту: “У адзіноты няма твару, але заўсёды ёсць гаспадар, які носіць яе ў сабе і не ведае, што ён раб. Забярыце ў яго адзіноту і што застанецца ад яго?” [9, с. 90].

Што датычыцца кахання, то яно ў беларускай мужчынскай прозе ў многіх выпадках адлюстроўваецца праз жаданне фізічнай блізкасці. Згодна з тэорыяй неафрэйдыстаў, усведамленне чалавекам сваёй індывідуальнай сутнасці, адасобленасці ад астатніх выклікае пачуццё экзістэнцыйнай трывогі, і імкненне чалавека кахаць, якое часта замяшчаецца задавальненнем сэксуальных патрэбаў, ёсць прамым вынікам уцёкаў ад такой трывогі. У экзістэнцыялізме чалавек спасцігае сваю адказнасць не толькі за ўласнае існаванне, але і за ўсё чалавецтва таксама. І таму, калі трывога як адказнасць замяшчаецца каханнем ці фізічнай блізкасцю, гэтыя адносіны датычацца як асобнага індывіда, так і ўсяго чалавецтва ў цэлым. Фактычна такім чынам чалавек будуе сваю мадэль свету. Вядомы псіхолаг, філосаф і сацыёлаг Эрых Фром у сваёй кнізе “Мастацтва кахаць” піша наступнае: “Відавочна, што для большасці людзей нашай культуры здольнасць абуджаць любоў – гэта, па сутнасці, спалучэнне сімпатычнасці і сексуальнай прывабнасці” [10].

Разглядаючы паводзіны і думкі героя трыпціха Б. Пятровіча “Стах”, можна сказаць, што цэнтрам існавання, адпраўным пунктам усіх яго намераў і дзеянняў з’яўляецца імкненне да фізічнай блізкасці з жанчынай, якое герой несвядома ўспрымае як сімулякр кахання і таму ўвесь час імкнецца апраўдаць сваю патрэбу.

Як мы бачым з усяго вышэй сказанага, вырашэнне асноўных праблем экзістэнцыі ў беларускай літаратуры спрабуюць знайсці пісьменнікі і пісьменніцы, што працуюць у розных накірунках, адлюстроўваючы існаванне чалавека ў самых разнастайных яго праявах, якія кожны аўтар бачыць па-свойму. Адрозненні і падабенствы ў поглядах сучасных беларускіх пісьменнікаў і пісьменніц на праблемы чалавечага існавання, на наш погляд, з’яўляюцца цікавым матэрыялам для вывучэння на міждысцыплінарным узроўні.

## Літаратура


1 Вежнавец, Е. Шлях дробнай сволачы / Е. Вежнавец. – Мінск : Логвінаў, 2008. – 152 с.

2 Вежнавец, Е. Паражылі зіму [Электронны рэсурс] / Е. Вежнавец. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Jeva_Vieznaviec/Pierazyli_zimu.html. – Дата доступу: 24.04.2017.

3 Брава, А. Каменданцкі час для ластавак: аповесці, апавяданні / А. Брава. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 115 с.

4 Брава, А. Рай даўно перанаселены: раман, аповесці / А. Брава. – Мінск : Галіяфы, 2012. – 278 с.

5 Гапеева, В. Рэканструкцыя неба / В. Гапеева. – Мінск : Логвінаў, 2003. – 144 с.

6 Морт, В. Я тоненькая як твае вейкі / В. Морт. – Мінск : Логвінаў, 2005. – 109 с.

7 Сартр, Ж.-П. Экзистенциализм – это гуманизм [Электронный ресурс] / Ж.-П. Сартр. – Режим доступу: http://royallib.com/books/sartr_ganpol/ekzistentsializm_eto_gumanizm.htm. – Дата доступу: 14.01.2017.

8 Бабкоў, І. Хвілінка: тры гісторыі / І. Бабкоў. – Мінск : Логвінаў, 2013. – 231 с.

9 Пятровіч, Б. Экспрэс, альбо няспраўджанасць адзіноты / Б. Пятровіч // Дзеяслоў, 2002. – № 4. – С. 84–111.

10 Фромм, Э. Искусство любить [Электронны рэсурс] / Э. Фромм. – Рэжым доступу: http://thelib.ru/books/fromm_erih/iskusstvo_lyubit.html. – Дата доступу: 23.03.17.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ